# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2(92) 2017**

**СЕРЫЯ 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**



***Галоўны рэдактар*** **А. І. Жук**

***Рэдакцыйная калегія:***

А. П. Жытко (нам. галоўнага рэдактара) (Рэспубліка Беларусь)
Т. М. Буйко (Рэспубліка Беларусь)
Л. М. Давыдзенка (Рэспубліка Беларусь)
А. В. Данільчанка (Рэспубліка Беларусь)
М. М. Забаўскі (Рэспубліка Беларусь)
Г. У. Карзенка (Рэспубліка Беларусь)
І. В. Катляроў (Рэспубліка Беларусь)
В.Б. Келер (Федэратыўная Рэспубліка Германія)
В. В. Кірылаў (Расійская Федэрацыя)
А. Я. Кучко (Рэспубліка Беларусь)
А. С. Лапцёнак (Рэспубліка Беларусь)
А. М. Люты (Рэспубліка Беларусь)
У. Ф. Мартынаў (Рэспубліка Беларусь)
У. А. Мельнік (Рэспубліка Беларусь)
Я. Мірановіч (Рэспубліка Польшча)
Р. К. Мірзаханян (Рэспубліка Арменія)
А. І. Смолік (Рэспубліка Беларусь)
А. Г. Субоцін (Рэспубліка Беларусь)
А. Г. Шваб (Украіна)
А. М. Эскрыдж-Косміч (Злучаныя Штаты Амерыкі)



***Адрас рэдакцыі:***
Вул. Магілёўская, 37, пакой 124,
220007, Мінск,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.by



Пасведчанне № 1353 ад 06.05.10.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 21.06.17.
Фармат 60×84 $^1/_8$. Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 14,41. Ул.-выд. арк. 13,3.
Тыраж 100 экз. Заказ 412.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца друкаваных выданняў
№ 1/236 ад 24.03.14.
Ліцэнзія № 02330/448 ад 18.12.13.
Вул. Савецкая, 18,
220030, Мінск.

*Адказны сакратар* В. П. Андрыевіч
*Рэдактар* В. П. Андрыевіч
*Камп'ютарная вёрстка* В. С. Яворскай



© Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 2.


✧ ✧ ✧


У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 02.02.2011 г. № 26 часопіс «Весці БДПУ. Серыя 2» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, культуралагічных, палітычных, сацыяльных, філасофскіх, эканамічных (эканамічная тэорыя) навуках

*Часопіс «Весці БДПУ. Серыя 2» у адпаведнасці з Пастановай ВАКа ад 08.06.2009 № 3 выходзіць:*
№ 1, 3 па навуковых кірунках «Паліталогія», «Сацыялогія», «Эканоміка»;
№ 2, 4 па навуковых кірунках «Гісторыя», «Філасофія», «Культуралогія»

✧ ✧ ✧ ✧ ✧ ✧

У адпаведнасці з дагаворам паміж БДПУ і ТАА «Навуковая электронная бібліятэка» (ліцэнзійны дагавор № 676-12/2016 ад 21.12.2016 г.) часопіс «Весці БДПУ» (у 3-х серыях) размяшчаецца на платформе eLIBRARY.RU і ўключаны ў Расійскі індэкс навуковага цытавання (РІНЦ) – бясплатны агульнадаступны інструмент вымярэння публікацыйнай актыўнасці вучоных і арганізацый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 2. С. 28–32.

УДК 94 (476)"17/18":347.921

# ЗАКАНАДАЎЧАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ІНСТЫТУТА АДВАКАТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

**І. Г. Гушчынскі,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі*
*і славянскіх народаў БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 31.03.17.

UDC 94 (476)"17/18":347.921

# LEGAL ACTIVITIES OF THE BAR INSTITUTE ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE LATE XVIII – THE FIRST THIRD OF THE XIX CENTURIES

**I. Hushchynski,**
*Candidate of History, Associate*
*Professor of the Department of History*
*of Belarus and Slavic Nations, BSPU*

Received on 31.03.17.

Судаводства і судаўладкаванне на тэрыторыі Беларусі пасля ўключэння яе ў склад Расіі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў значна адрозніваліся ад унутрырасійскіх. Адметнай рысай судовай сістэмы краю быў удзел адвакатаў у судовым працэсе па грамадзянскіх справах. Гэта адпавядала спаборнай форме судовага працэсу. У аснове інстытута адвакатуры заходніх губерняў ляжалі нормы III Статута ВКЛ і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай, якія былі пакінуты расійскімі ўладамі ў дзеянні. Аднак у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. для рэгламентацыі розных аспектаў дзейнасці адвакатаў расійскім урадам быў выдадзены шэраг заканадаўчых актаў. Яны ў значнай ступені паўтаралі нормы Статута ВКЛ і сеймавых канстытуцый, але таксама ўтрымлівалі некаторыя ўдакладненні і новаўвядзенні, што было абумоўлена неабходнасцю прывядзення ў адпаведнасць наяўнай заканадаўчай базы з адміністрацыйна-судовым ладам краю, які сумяшчаў у сабе мясцовыя прававыя традыцыі і расійскія парадкі.

*Ключавыя словы:* адвакатура, судовая сістэма, Расійская імперыя, заходнія губерні, Статут ВКЛ 1588 г., XVIII стагоддзе, XIX стагоддзе.

At the end of the 18th century the territory of Belarus was annexed by the Russian Empire, but the local judicial system and court proceedings remained different from Russian domestic provinces until 1840. Participation of professional advocates in judicial proceeding was one of the main features. The activities of the bar of Western provinces of the Russian Empire was based on the rules of the Statute of the Grand Duchy of Lithuania of 1588 and Sejm constitutions of the Polish–Lithuanian Commonwealth, which remained in force. At the end of the 18th – the first third of the 19th century this legislative base was complemented and to some extent adjusted by a number of laws issued by the Russian Government. This adapted the activities of the bar of the Western provinces to the new administrative and judicial order, which combined local law traditions with Russian governance practices.

*Keywords:* bar, advocacy, judicial system, Russian Empire, Western provinces, Statute of the Grand Duchy of Lithuania, 18th century, 19th century.

*Уводзіны.* Судаводства і судаўладкаванне на тэрыторыі Беларусі пасля ўключэння яе ў склад Расіі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў значна адрозніваліся ад унутрырасійскіх. Адметнай рысай судовай сістэмы краю быў удзел адвакатаў у судовым працэсе па грамадзянскіх справах. У адрозненне ад так званых хадатаяў па справах, якія былі ва ўнутраных губернях Расіі, адвакаты заходніх губерняў прымалі непасрэдны ўдзел у судовых разбіральніцтвах, а не толькі займаліся складаннем і падачай папер. Іх прававы статус быў выразна вызначаны III Статутам ВКЛ, сеймавымі канстытуцыямі Рэчы Паспалітай і заканадаўчымі актамі Расійскай імперыі.

Праблема функцыянавання інстытута адвакатуры на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., у тым ліку яго заканадаўчага забеспячэння, дагэтуль застаецца параўнальна мала даследаванай. Адзінай спецыяльнай працай па гэтай тэме з'яўляецца артыкул польскага даследчыка С. Годэка [1], прысвечаны прававой рэгламентацыі дзейнасці адвакатаў Літоўскай губерні ў перыяд праўлення Паўла І. Да праблемы адвакатуры заходніх губерняў разглядаемага перыяду звярталіся ў кантэксце вывучэння больш шырокіх тэм А. Каравіцкі [2, с. 30–45], П. М. Жуковіч [3, с. 221], Я. У. Васькоўскі [4, с. 245], С. М. Гаўрылаў [5, с. 108–120], А. А. Кісялёў [6, с. 43–44, 56–57], М. Б. Смаленскі [7, с. 256], С. Годэк [8, с. 513–517] і некаторыя інш. Дадзеная праблематыка закранаецца таксама ў працах, прысвечаных вывучэнню права ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У некаторых з іх даволі падрабязна раскрываецца змест і сэнс артыкулаў Статутаў ВКЛ і сеймавых канстытуцый, якія вызначалі месца адвакатаў у судовым працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[9, с. 20–22; 10, с. 28–32, 35–57; 11, с. 94–120; 12, с. 5, 178–179, 227–230].

Крыніцавую базу прадстаўленага ў дадзеным артыкуле даследавання складаюць галоўным чынам заканадаўчыя акты: III Статут ВКЛ, сеймавыя канстытуцыі Рэчы Паспалітай, законы Расійскай імперыі. На момант уваходжання беларускіх зямель у склад Расіі судовыя ўстановы карысталіся польскамоўнымі версіямі III Статута ВКЛ. У пачатку XIX ст. было надрукавана прынамсі 2 выданні: у 1811 г. у Санкт-Пецярбургу на рускай і польскай мовах [13], і ў 1819 г. у Вільні на польскай [14]. Пры падрыхтоўцы артыкула тэксты сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай браліся з 9-томнага зборніка Volumina Legum, а расійскіх законаў – з «Полного собрания законов Российской империи».

Дэталёвае раскрыццё розных аспектаў функцыянавання інстытута адвакатуры на тэрыторыі Беларусі, у прыватнасці яго заканадаўчага забеспячэння, стварае ўмовы для больш поўнай рэканструкцыі судова-прававой сістэмы заходніх губерняў дадзенага перыяду, спрыяе асэнсаванню сутнасці палітыкі самадзяржаўя ў краі.

*Асноўная частка.* Заканадаўчую рэгламентацыю інстытут адвакатуры на тэрыторыі Беларусі атрымаў яшчэ ў XVI ст. – у Статутах ВКЛ. Моц дзеяння III Статута (1588 г.) захоўвалася да 1840 г. Удзелу ў судовым працэсе асоб, упаўнаважаных адным з бакоў для вядзення справы, прысвечаны 56–61 артыкулы IV раздзела. У арыгінальным тэксце 1588 г. і польскіх перакладах яны называюцца «пракуратарамі», але ўжо ў перакладзе на рускую мову 1811 г. выкарыстоўваюцца тэрміны «адвокат» і «поверенный» [13, с. 384]. У III Статуце замацоўвалася права весці справу ў судзе праз даверaных асоб, вызначалася працэдура допуску адвакатаў да справы. Былі прадугледжаны пэўныя абмежаванні на права быць пaвераным у судзе, а таксама адказнасць адвакатаў за шкоду, нанесеную даверніку (аж да смяротнага пакарання). Статут утрымліваў норму аб прызначэнні судом бясплатнага адваката для тых, хто па прычыне беднасці не мог аплаціць яго паслугі (напрыклад, сіроты і ўдовы) [13, с. 383–393].

Нарматыўна-прававая база інстытута адвакатуры дапаўнялася канстытуцыямі Сейма Рэчы Паспалітай. У іх адвакаты называюцца «пракуратарамі», «патронамі», «юрыстамі», «мецэнасамі», «палестрантамі», «пленіпатэнтамі», памочнікі адвакатаў згадваюцца пад тэрмінамі «агенты», «дэпендэнты», «атэндэнты», «аплікан-ты». У XVIII ст. для адвактуры ўстанавіўся абагульняючы тэрмін «палестра» [11, с. 11–13]. Натуральна, Статут ВКЛ за такі працяглы час свайго дзеяння патрабаваў удакладнення, тлумачэння, дапаўнення па многіх аспектах судаводства і судаўладкавання, у тым ліку звязаных з функцыянаваннем адвакатуры. Напрыклад, у сеймавых канстытуцыях 1726, 1764, 1766 гг. замацоўваліся крытэрыі, якім павінны былі адпавядаць адвакаты. Імі маглі быць толькі маёнткавыя дваране, не заўважаныя ні ў якіх злачынствах і дасведчаныя ў праве. Абавязковай была прысяга па вызначанай форме [15, с. 179, 223, 246; 16, с. 226–227]. Канстытуцыя 1768 г. дазваляла і не дваранам займацца адвакацкай дзейнасцю ў судах, акрамя земскіх, гродскіх і Трыбуналу [16, с. 353]. Што датычыць правіла аб абавязковай наяўнасці маёнтка, то на практыцы яно не выконвалася [2, с. 32]. У канстытуцыях 1638, 1726, 1764, 1768 гг. удакладняліся і канкрэтызаваліся некаторыя дзеянні, якія лічыліся недапушчальнымі для адвакатаў у іх прафесійнай дзейнасці. Да іх адносілася: адмова ад ужо ўзятай справы без важкіх прычын, перадача папер і дача парад супрацьлегламу боку, нядбайныя адносіны да абавязкаў, парушэнне парадку ў судзе, наўмыснае замаруджванне судовага працэсу шляхам розных прыёмаў, некаторыя іншыя учынкі. Вызначаліся таксама меры пакарання за такія дзеянні [17, с. 444; 15, с. 244; 16, с. 143, 16, 327–328, 179]. На якасці правасуддзя негатыўным чынам адбівалася праблема «бясконцай колькасці тых, хто ўзяў на сабе імя палестры» [16, с. 327]. У сувязі з гэтым былі ўведзены абмежаванні колькасці адвакатаў. Паводле канстытуцый 1764 і 1768 г. для вядзення адной канкрэтнай справы дапускалася не больш двух абаронцаў з кожнага боку (для найбольш буйных спраў – трох) [16, с. 179, 328]. Канстытуцыя 1766 г. абмяжоўвала колькасць адвакатаў Трыбунала. Падчас адной кадэнцыі іх дапускалася не больш за 30, не лічачы памочнікаў [16, с. 327]. У судах першай інстанцыі (гродскіх, земскіх і інш.) лічба адвакатаў на заканадаўчым узроўні акрэслена не была [9, с. 21]. Наогул, па сваім аб'ёме масіў featureрознага роду пастаноў Сейма Рэчы Паспалітай, якія датычаць адвакатуры, перавышае адпаведныя артыкулы III Статута ВКЛ.

Пасля ўключэння тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі тут былі захаваны мясцовыя прававыя нормы ў грамадзянскім судаводстве [18]. Трэба адзначыць, што гэта датычыць і канца XVIII ст., калі на тэрыторыі Магілёўскай, Полацкай і Мінскай губерняў Кацярынай II былі ўведзены і дзейнічалі «Учреждения для управления губерний…» 1775 г. Адпаведна, інстытут адвакатуры функцыянаваў у краі аж да моманту канчатковага скасавання тут дзеяння Статута ВКЛ і сеймавых канстытуцый пры Мікалаі I (у 1831 г. – у Магілёўскай і Віцебскай, у 1840 г. – у Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях) [19; 20]. Увогуле, нарматыўна-прававая база судовай сістэмы заходняга краю ў дадзены перыяд была даволі груваасткай і заблытанай. Адначасова мелі моц як нормы мясцовага права, так і расійскія за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

коны. Сітуацыя ўскладнялася тым што ні ў свой час у Рэчы Паспалітай, ні на той момант у Расійскай імперыі не былі створаны кадыфікаваныя зводы законаў. Для расійскіх улад значную складанасць уяўляла і тое, што сеймавыя канстытуцыі былі запісаны на польскай мове і мелі спецыфічную лексіку з шырокім выкарыстаннем лацінамоўных юрыдычных тэрмінаў. Усё гэта абумоўлівала неабходнасць выдання заканадаўчых актаў, якія б садзейнічалі прыстасаванню мясцовых судова-прававых парадкаў да рэалій часу. У канцы XVIII – першай трэці XIX ст. расійскім урадам быў прынятаы шэраг заканадаўчых актаў, якія датычылі адвакатуры заходніх губерняў.

У 1797 г. грамадзянскі губернатар Літоўскай губерні Я. І. Булгакаў звярнуўся ў Сенат з дакладам аб вызначэнні і абмежаванні колькасці адвакатаў у яго губерні. Даклад быў зацверджаны і пасля падпісання 14 снежня 1797 г. імператарам Паўлам І набыў сілу закона [21]. У ім гаварылася аб тым, што катэгорыя асоб, «вядомых там пад імем адвакатаў, патронаў, агентаў, юрыстаў і пад агульнай назвай палестры», замест таго, каб дапамагаць суцяжнікам у атрыманні, а судам – у вынясенні справядлівых рашэнняў, «часцей толькі памнажае паклёпы, разлады, сваркі і бывае прычынай варожасці і разарэння фамілій». У сувязі з гэтым губернатар прапаноўваў прыняць шэраг мер для рэгламентацыі дзейнасці адвакатаў. Па большай частцы яны ўяўлялі сабой паўтарэнне і замацаванне правілаў, прадугледжаных III Статутам ВКЛ і сеймавымі канстытуцыямі, але таксама ўтрымлівалі пэўныя ўдакладненні і карэктывы ў існуючую практыку.

У дакладзе Я. Я. Булгакава вызначаліся крытэрыі для атрымання права займацца адвакацкай дзейнасцю ў судах: дваранскае паходжанне, «валоданне сваімі вёскамі» ў Літоўскай губерні (для гарадскіх адвакатаў магістратаў і ратуш – наяўнасць лаўкі ці маёнтка ў дадзеным горадзе), добрая рэпутацыя, пасведчанне аб адукацыі, навучанне на працягу некалькіх год у дасведчанага ў судаводстве чалавека ці ў канцылярыі пад наглядам рэгента (так называлася пасада загадчыка канцылярыі суда [22, с. 307]). Для допуску ў Галоўны літоўскі суд Я. І. Булгакаў лічыў патрэбным усталяваць для адвакатаў неабходны тэрмін працы (6 год) у ніжэйшых установах, наяўнасць адпаведных пасведчанняў адтуль аб «добрых паводзінах» і колькасці скончаных міравых спраў, «строгі экзамен». Літоўскі грамадзянскі губернатар таксама падкрэсліў неабходнасць дазволу суцяжнікам самім, без адваката, «хадзіць перад судом», што рабіла правасуддзе больш даступным для насельніцтва. Акрамя таго, немаёмным і сіротам суд павінен быў прызначыць адваката без платы. Я. І. Булгакаў лічыў патрэбным скасаваць практыку ўтрымання Галоўным літоўскім судом і некаторымі павятовымі судамі «агентаў», якіх маглі выкарыстоўваць адвакаты для «нашэння і чытання дакументаў і іншага», бо яны, па большай частцы, на думку губернатара, былі ні да чаго не здольныя і толькі памнажалі выдаткі суцяжнікаў. У дакладзе прыведзены пералік прычын (12 пунктаў), па якіх адвакат мог быць адхілены ад сваёй пасады. Сэнс іх заключаўся ў наступным: 1) падгаворванне кагосьці да несправядлівай цяжбы; 2) нядбайныя адносіны да абавязкаў; 3) здрада даверніку; 4–5) імкненне атрымаць карысць са справы, акрамя непасрэдна аплаты сваіх паслуг; 6) частае зацягванне судовага працэсу і стварэнне яму перашкод сваімі прамовамі ці беспадстаўная лаянка на супрацьлеглы бок; 7) з'яўленне п'яным ў судзе ці пропуск пасяджэння па прычыне п'янства; 8) удзел у забароненых картачных гульнях ці «якіхсьці распустах»; 9) хабарніцтва, патрабаванне ці атрыманне несуразмернай важнасці справы ўзнагароды за працу; 10) абвінавачванне ў крымінальным злачынстве; 11) адлучэнне ад месца без ведама суда падчас кадэнцый (тэрмінаў пасяджэнняў суда [22, с. 49]); 12) невыконванне альбо нядбайнае выкананне абавязкаў «хадзіць за справай» сірот ці немаёмных. Пры пакіданні пасады адвакаты павінны былі ўзяць у адпаведным судзе пасведчанне аб сваіх паводзінах і працы, без якога яны не маглі быць прыняты ні на якую іншую службу.

Важным пунктам даклада Я. І. Булгакава было дакладнае вызначэнне колькасці адвакатаў у судах Літоўскай губерні: у Галоўным літоўскім судзе – 18, у гродскіх і земскіх судах кожнага павета – па 10, кансісторскіх – па 6, у магістратах і ратушах – у залежнасці ад колькасці жыхароў канкрэтнага горада (у Вільні –10, Гродне – 8, Коўне – 6, астатніх – па 5). Усяго дадзеная лічба склала 269 (з улікам 12 адвакатаў кансісторскіх судоў Віленскай і Жмудскай каталіцкіх епархій).

Непасрэдны прыём у адвакатуру губернатар прапаноўваў ажыццяўляць самімі судовымі ўстановамі шляхам выбару «сакрэтнымі галасамі» з кола кандыдатаў на адпаведную вакантную пасаду. Аднак Сенатам было прынята рашэнне, што выбары адвакатаў (тэрмінам на 3 гады) павінны праводзіцца мясцовым дваранствам. Гэта быў адзіны пункт даклада Я. І. Булгакава, які не быў ухвалены Сенатам. Аднак ужо 11 сакавіка 1798 г. Паўлам І быў падпісаны ўказ, згодна якому выбары адвакатаў ажыццяўляліся, як першапачаткова прапаноўваў Літоўскі грамадзянскі губернатар, судамі, але тэрмін быў пакінуты – 3 гады [23].

Прыведзеныя вышэй пастановы датычылі толькі Літоўскай губерні. На астатнія «ад Польшчы далучаныя губерні» іх дзеянне было пашырана ў адпаведнасці з указам Аляксандра І ад 17 верасня 1811 г. [24].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На практыцы функцыянаванне інстытута адвакатуры сутыкнулася з шэрагам праблем, якія вынікалі з груваскасці і ў пэўным сэнсе заблытанасці дзеючага заканадаўства. Напрыклад, суцяжнікі мелі права самі абараняць свае інтарэсы ў судзе, але закон прама не дазваляў і не забараняў прыцягваць да вядзення справы давераных асоб не з ліку афіцыйных адвакатаў адпаведнай судовай установы. У 1817–1821 гг. дадзеная праблема была прадметам дыскусій у Сенаце і Дзяржаўным савеце [25, с. 534–539]. Повадам да гэтага паслужыла прапанова сенатара Балотнікава адмяніць прынятае яшчэ ў 1811 г. рашэнне Кіеўскага галоўнага суда дазволіць «хаджэнне па справах» толькі выбраным ім адвакатам. Большая колькасць як сенатараў, так і членаў Дзяржаўнага савета (10 супраць 5-ці) выказалася за забарону камусьці, акрамя «выбраных урадам адвакатаў», весці справы ў судзе, меншая частка, адпаведна, выступіла за дазвол такой практыкі [26, с. 224–225]. Аднак Аляксандр І пагадзіўся з меркаваннем менавіта апошніх, падпісаўшы 27 чэрвеня 1821 г. адпаведны ўказ [27]. Такім чынам, суцяжнікам было афіцыйна дазволена прыцягваць для ўдзелу ў якасці паверанага ў сваіх справах асоб, якія не з'яўляліся адвакатамі адпаведнай судовай установы.

Прычынай пэўных цяжкасцей у працы судоў стала таксама тое, што пры прызначэнні бясплатных адвакатаў маламаёмным не былі вызначаны адпаведныя крытэрыі. Магілёўскі галоўны суд звярнуўся ў Сенат за тлумачэннямі і прапановай выкарыстоўваць у такіх сітуацыях правілы аб перакладах дакументаў у галоўных судах, прадугледжаных указам ад 7 мая 1809 г. [25, с. 551–552; 28]. У адпаведнасці з імі прасіцель павінен быў даць суду пасведчанне аб сваёй беднасці (шляхціц – ад павятовага маршалка, мешчанін і купец – ад магістрата ці ратушы, яўрэй – ад кагала), а таксама асабіста пацвердзіць гэта прысягай. Пасля абмеркавання ў Сенаце, Камісіі па складанні законаў і Дзяржаўным савеце дадзеная норма была ўхвалена Аляксандрам І і 2[illegible] лютага 1822 г. набыла сілу закона [29].

Яшчэ адным заканадаўчым актам, які датычыў інстытута адвакатуры на тэрыторыі Беларусі стаў зацверджаны Аляксандрам І 22 красавіка 1825 г. даклад вялікага князя Канстанціна Паўлавіча, у якім утрымлівалася меркаванне аб неабходнасці забараніць у «далучаных ад Польшчы губернях» друк адвакацкіх прамоў і любых папер па судовых справах без папярэдняй цэнзуры [30]. У Статуце аб цэнзуры, падпісаным Мікалаем І 10 чэрвеня 1826 г. [31], гэтаму прысвечана 17-я глава («Об адвокатских голосах, позывах, манифестах и других статьях по тяжбенным делам в присоединённых от Польши губерниях»). У ёй асабліва падкрэслена, што Віленскі цэнзурны камітэт павінен строга трымацца правілаў з арт. 165 і 168 дадзенага Статута (аб парушэнні аўтарам абавязкаў вернападданых адносін да асобы імператара і павагі да членаў імператарскага дому, аб ганьбаванні манархічнай формы кіравання). Акрамя таго, гаварылася аб недапушчальнасці ў адпаведных паперах, па-першае, чагосьці абразлівага для суддзяў, чыноўнікаў і суцяжнікаў, а па-другое, любых пабочных разважанняў. Для таго каб працэдура цэнзуравання «адвакацкіх галасоў» не стварала залішніх перашкод судоваму працэсу, цэнзурнаму камітэту прапісвалася пры паступленні такіх папер разглядаць не менш 6-ці аркушаў за дзень.

Ва ўказе Мікалая І ад 25 студзеня 1828 г. [32] пацвярджалася, што выбары адвакатаў павінны адбывацца на падставе правілаў, усталяваных сеймавымі канстытуцыямі Рэчы Паспалітай 1726 і 1764 г. Прычынай прыняцця дадзенага закона стала неабходнасць удакладнення, ці маюць права быць выбранымі ў якасці адвакатаў асобы, якія валодаюць маёнткамі на так званым застаўным праве (заснавана на магчымасці крэдытора распараджацца маёмасцю даўжніка [33, с. 318]). Указ тлумачыў, што вотчыннікі і застаўныя ўладальнікі ў дадзеным кантэксце маюць роўныя правы.

Паўстанне 1830–1831 гг. справакавала ўзмацненне палітыкі самадзяржаўя па інтэграцыі далучаных тэрыторый у склад Расійскай імперыі. У судова-прававой сферы гэты знайшло адлюстраванне ў скасаванні дзеяння Статута ВКЛ і ўкараненні сістэмы судовых органаў расійскага ўзору ў краі. Адпаведна дзейнасць адвакатуры як юрыдычна аформленага інстытута спынялася. На тэрыторыі Беларусі адвакатура была адноўлена ў канцы 1883 г., калі былі Віцебскі, Магілёўскі, Мінскі, Гродзенскі, Віленскі акруговыя суды.

*Заключэнне.* Наяўнасць інстытута адвакатуры, рэгламентаванага заканадаўча, была важнай асаблівасцю функцыянавання судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. Гэта адпавядала спаборнай форме судовага працэсу (ва ўнутраных губернях ён быў следчым (інквізіцыйным). У аснове інстытута адвакатуры заходніх губерняў ляжалі нормы ІІІ Статута ВКЛ і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай, якія былі пакінуты расійскімі ўладамі ў дзеянні. Аднак у канцы XVIII – першай трэці XIX ст. для рэгламентацыі розных аспектаў дзейнасці адвакатаў расійскім урадам быў выдадзены шэраг заканадаўчых актаў. Яны ў значнай ступені паўтаралі нормы Статута ВКЛ і сеймавых канстытуцый, але таксама ўтрымлівалі некаторыя ўдакладненні і наваўвядзенні, што было абумоўлена неабходнасцю прывядзення ў адпаведнасць наяўнай заканадаўчай базы з адміністрацыйна-судовым ладам краю, які сумяшчаў у сабе мясцовыя прававыя традыцыі і расійскія парадкі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

